

**Раённая алімпіяда**
**па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет»**
**4 клас (адказы)**
**2021/2022 навучальны год**

**Максімальная колькасць балаў – 44**

| № п/п | Заданні | Коль-касць балаў |
|---|---|---|
| **1.** | **Як называецца частка свету, у якой знаходзіцца Рэспубліка Беларусь: *Еўропа,*** Еўразія, Азія?<br>**У якіх паўшар'ях Зямлі знаходзіцца наша краіна:** Паўднёвым або ***Паўночным***, Заходнім або ***Усходнім***?<br>*Правільныя адказы падкрэслі* | **3 б.** |
| **2.** | **Што такое веча? Падкрэслі адказ:**<br>1) збор княжацкіх дружыннікаў;<br>2) сход князя і яго дружыннікаў;<br>***3) старажытны агульнанародны сход;***<br>4) саюз князёў. | **1 б.** |
| **3.** | **З дадзеных назваў складзі ланцужок воднага шляху "з варагаў у грэкі":**<br>Дняпро, Балтыйскае мора, Заходняя Дзвіна, Чорнае мора, волак<br>***Балтыйскае мора – Заходняя Дзвіна – волак – Дняпро – Чорнае мора*** | **5 б.** |
| **4.** | **Знайдзі памылку, закрэслі яе, напішы правільныя словы або дату.**<br>1) Абласнымі гарадамі з'яўляюцца Брэст, ***Гомель, Віцебск,*** Гродна, Магілёў, Мінск.<br>2) Працягласць нашай краіны з поўначы на поўдзень 520 км, а з захаду на ўсход – ***560*** км.<br>3) Наша краіна размяшчаецца ў самым цэнтры ***Еўропы.***<br>4) Плошча нашай краіны каля ***207*** квадратных км. | **4 б.** |
| **5.** | **Напішы:**<br>✓ Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь: ***Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка***<br>✓ Сталіца нашай дзяржавы***: г.Мінск***<br>✓ Галоўныя сімвалы дзяржавы: ***герб, сцяг, гімн***<br>✓ Асноўны закон нашай дзяржавы: ***Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь***<br>✓ Калі адзначаюць Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь: ***3 ліпеня*** | **5 б.** |
| **6.** | **На палях Беларусі вырошчваюць збожжавыя культуры: жыта, пшаніцу, авёс, ячмень. З якіх культур пякуць хлеб, а з якіх робяць крупяныя вырабы?**<br>Хлеб: ***жыта, пшаніца***<br>Крупяныя вырабы: ***авёс, ячмень*** | **2 б.** |
| **7.** | **Якую раку ў Беларусі называюць незвычайнай? Чаму?**<br>***Няміга. У старажытным Мінску яна з'ўлялася ракой-вуліцай,*** | **5 б.** |

| | | |
|---|---|---|
| | ***па якой плавалі гарадскія жыхары, потым яна змялела і звузілася Сёння яна цячэ ў падземнай трубе пад вуліцай Няміга, што у Мінску.*** | |
| **8** | **Чым знакаміты беларускія гарады?**<br>Жодзіна _ - ***вырабляюць магутныя самазвалы.***<br>Салігорск – ***здабываюць калійныя ўгнаенні.***<br>Астравец – ***атамная электрастанцыя.***<br>Наваполацк – ***завод па пераапрацоўцы нафты.***<br>_______________________________________________ | **4 .** |
| **9.** | **Успомні прозвішчы беларускіх пісьменнікаў. Насупраць кожнай літары запішы па 2 прозвішчы пісьменнікаў. (Літара можа быць у пачатку, сярэдзіне, канцы прозвішча)**<br>М ***М***уравейка, Ша***м***якін<br>О К***о***лас, Бр***о***ўка<br>В ***В***ітка, ***К***рапіва<br>А Куп***а***ла, Т***а***нк | **4 б.** |
| **10.** | **Адгадайце, якія дрэвы вялі гэтую гутарку.**<br>Расхвалілася дрэва сваім восеньскім уборам:<br>- Прыгажэй маёй вопраткі не прыдумаеш: тут і чырвонае, і зялёнае, і ружовае, і памяранцавае (оранжевое), і жоўтае. У іншага ліста што ні вугалок, то іншы колер.<br>- А я лічу, што такі пярэсты ўбор для самавітага(солидного) дрэва непрыстойны, - сказала суседняе дрэва. - Самы сціплы і самы прыгожы колер - зялёны. Я гэтаму колеру ніколі не змяню. Так і ападзе маё лісце зялёным. І куткі-то ў цябе на лісці - лішняе. Значна лепш дробныя зубчыкі, як у мяне.<br>*Адказ:* ***Клён і алешына*** | **2 б.** |